Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар БДУКМ
______________ Ю. П. Бондар
«____» ____________2015 г.
Рэгістрацыйны № ВД-____/баз.

# ПРАФЕСІЙНАЯ ПЕДАГОГІКА І МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦДЫСЦЫПЛІН
## Раздзел 1. ПРАФЕСІЙНАЯ ПЕДАГОГІКА

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2015

**СКЛАДАЛЬНІК**

*М. Л. Кузьмініч*, прафесар кафедры тэорыі музыкі і музычнай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Н. П. Яканюк,*прафесар кафедры тэорыі музыкі і музычнай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар мастацтвазнаўства, прафесар;
*І. А. Малахава,*прафесар кафедры псіхалогіі і педагогікі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар педагагічных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* тэорыі музыкі і музычнай адукацыі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 18.04. 2014 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 18.06.2014 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: М. Л. Кузьмініч

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вывучэнне курса «Прафесійная педагогіка» з’яўляецца важнай часткай прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў да практычнай работы ў якасці педагога (трэнера, кіраўніка студыі, харэаграфічнага калектыву), арганізатара мастацка-эстэтычнага выхавання дзяцей і дарослых. Асноўны змест курса складаюць пытанні гісторыі развіцця сістэмы мастацкай адукацыі, метадалагічныя і тэарэтычныя асновы арганізацыі працэсаў мастацка-прафесійнага выхавання, навучання і развіцця асобы, шляхі ўдасканалення падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў педагогаў у галіне харэаграфічнага мастацтва і сацыякультурнай дзейнасці.

Прафесійная педагогіка з’яўляецца адгалінаваннем агульнай педагогікі і таму падпарадкоўваецца яе заканамернасцям і прынцыпам, хаця мае і свае, спецыфічныя. Метадалагічную аснову прафесійнай педагогікі складае эстэтыка, якая вывучае агульнаэстэтычныя заканамернасці развіцця мастацтва і непасрэдна ўплывае на вызначэнне мэты, задач і зместу курса. У вырашэнні праблем прафесійная педагогіка абапіраецца таксама на мастацтвазнаўства, псіхалогію, фізіялогію і іншыя навукі. Разам з курсамі «Псіхалогія», «Методыка выкладання», педагагічнай практыкай прадмет «Прафесійная педагогіка» ўтварае блок дысцыплін, якія забяспечваюць педагагічную падрыхтоўку спецыялістаў да дзейнасці ў сферах культуры і адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

*Мэтай вучэбнай дысцыпліны* з’яўляецца фарміраванне навукова абгрунтаваных уяўленняў аб заканамернасцях працэсаў мастацка-прафесійнага (харэаграфічнага) выхавання, навучання і развіцця асобы.

*Асноўнымі задачамі* курса з’яўляюцца:

– засваенне ведаў з гісторыі станаўлення сістэмы мастацка-прафесійнай адукацыі, тэарэтычных асноў працэсаў харэаграфічнага выхавання, навучання і развіцця асобы;

– фарміраванне асноў педагагічнага майстэрства ў будучых спецыялістаў;

– выхаванне ўстойлівага інтарэсу да прафесіі педагога, імкнення да мастацка-педагагічнай самаадукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– асноўныя прафесійна-педагагічныя паняцці і катэгорыі, значэнне прафесійнай педагогікі ў сістэме навук аб чалавеку і грамадстве, аб культуры і мастацтве;

– асноўныя палажэнні сучасных канцэпцый прафесійнай адукацыі асобы, педагагічныя спосабы, метады, тэхналогіі, якія забяспечваюць эфектыўнасць прафесійна-педагагічнага развіцця і самаўдасканалення; сусветныя тэндэнцыі развіцця прафесійнай адукацыі;

– нацыянальную сістэму прафесійнай адукацыі і асаблівасці яе мадэрнізацыі;

– прынцыпы выкарыстання прафесійна-педагагічных ведаў для рашэння асобасных, сацыяльных і прафесійна-педагагічных задач;

– генезіс прафесійна-педагагічных ведаў на розных ступенях развіцця грамадства, гісторыю развіцця беларускай прафесійна-педагагічнай думкі (этапы і персаналіі);

– сістэму прафесійнай адукацыі, сучасныя тэндэнцыі яе развіцця ў Беларусі і замежных краінах;

– прафесійна-педагагічныя асновы фарміравання асобы сродкамі мастацтва і ў працэсе мастацка-творчай дзейнасці, навуковыя асновы арганізацыі прафесійна-педагагічнага працэсу; навуковыя падыходы і крытэрыі адбору зместу прафесійнай адукацыі, тэхналогіі распрацоўкі вучэбных планаў, праграм, падручнікаў, вучэбна-метадычнай дакументацыі, заканамернасці і арганізацыйныя формы педагагічнага працэсу ва ўстановах асноўнай і дадатковай прафесійнай адукацыі; спецыфіку ўздзеяння мастацтва на асобу;

– асаблівасці арганізацыі прафесійна-педагагічнага працэсу з рознымі групамі насельніцтва;

– структуру, змест і шляхі ўдасканалення прафесійна-педагагічнага майстэрства;

– заканамернасці, сродкі, формы і метады развіцця асобы ў прафесійна-педагагічным працэсе; структуру і кіраванне сістэмай прафесійнай адукацыі Рэспублікі Беларусь;

*умець:*

– здзяйсняць і арганізоўваць прадуктыўныя прафесійна-педагагічныя зносіны;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– улічваць заканамернасці і прынцыпы працэсу прафесійнай адукацыі пры аналізе і здзяйсненні грамадскай і адукацыйнай практыкі;

– выкарыстоўваць прафесійна-педагагічныя веды, метады і сучасныя тэхналогіі прафесійнага навучання, выхавання і развіцця асобы для рашэння прафесійна-педагагічных задач;

– здзяйсняць адэкватную самаацэнку, распрацоўваць і рэалізоўваць праекты прафесійна-педагагічнага самаўдасканалення;

– выкарыстоўваць традыцыйныя і інавацыйныя сродкі, формы і метады прафесійнай адукацыі асобы;

*мець навыкі:*

– самастойнага прафесійна-педагагічнага мыслення;

– выкарыстання ведаў у прафесійна-педагагічнай практыцы;

– прафесійна-педагагічнага самаўдасканалення, прафесійна-педагагічнай творчасці ў галіне прафесійнага, аматарскага і фальклорнага мастацтва.

У адпаведнасці з вучэбнымі планамі на вывучэнне раздзела «Прафесійная педагогіка» вучэбнай дысцыпліны «Прафесійная педагогіка і методыка выкладання спецдысцыплін» усяго прадугледжана 86 гадзін, з якіх 30 гадзін аўдыторных заняткаў (20 гадзін – лекцыі, 10 гадзін – семінары).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўд. гадзін | |
|---|---|---|
| | лекц. | сем. |
| **Уводзіны** | 1 | - |
| **Раздзел І. Метадалагічныя асновы прафесійнай педагогікі** | 3 | - |
| *Тэма 1*. Прафесійная адукацыя як цэласны працэс | 1 | - |
| *Тэма 2.* Мастацкая адукацыя як сістэма ўстаноў агульнай і прафесійнай мастацкай адукацыі | 1 | - |
| *Тэма 3.* Мастацкая адукацыя як вынік мастацка-педагагічнага працэсу | 1 | - |
| **Раздзел ІІ. Тэарэтычныя асновы мастацка-адукацыйнага працэсу** | 8 | 6 |
| *Тэма 4.* Тэарэтычныя асновы харэаграфічнага выхавання | 2 | 2 |
| *Тэма 5.* Тэарэтычныя асновы харэаграфічнага навучання | 2 | 2 |
| *Тэма 6.* Тэарэтычныя асновы харэаграфічнага развіцця | 2 | 2 |
| *Тэма 7.* Метады, сродкі, формы мастацка-педагагічнай дзейнасці | 2 | - |
| **Раздзел ІІІ. Антагенез харэаграфічнай і музычнай адукацыі** | 4 | 2 |
| *Тэма 8.* Прадмет гісторыі мастацкай адукацыі. Перыядызацыя гісторыі мастацкай адукацыі. Ідэі музычна-эстэтычнага выхавання асобы ў старажытныя часы, у сярэдневяковай Еўропе, на беларускіх і рускіх землях да XIV ст. | 1 | - |
| *Тэма 9.* Станаўленне і развіццё харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў эпоху Адраджэння (XIV–XVI стст.) і Асветы (XVII–XVIII стст.) у Заходняй Еўропе, Расіі, на беларускіх землях | 1 | - |
| *Тэма 10.* Харэаграфічная і музычная адукацыя ў Заходняй Еўропе, Расіі, на беларускіх землях у XIX – пачатку XX ст. Станаўленне і развіццё харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў XX ст. Замежныя сістэмы харэаграфічнай і музычнай адукацыі XX ст. | 1 | - |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | |
|---|---|---|
| *Тэма 11.* Установы і арганізацыі падсістэм агульнай і прафесійнай харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь | 1 | - |
| **Раздзел IV. Мастацка-педагагічнае майстэрства** | 4 | 2 |
| *Тэма 12.* Паняцце, структура, этапы і шляхі фарміравання мастацка-педагагічнага майстэрства | 1 | - |
| *Тэма 13.* Змест мастацка-педагагічнага майстэрства | 1 | - |
| *Тэма 14.* Педагагічная тэхніка як сродак рэалізацыі мастацка-педагагічнага майстэрства | 1 | - |
| *Тэма 15.* Менеджмент дзіцячай школы мастацтваў: майстэрства і тэхналогія кіраўнічай дзейнасці | 1 | - |
| **Усяго…** | **20** | **10** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Уводзіны

Месца і роля прафесійнай педагогікі ў сістэме навуковых і вучэбных дысцыплін. Мэта, задачы і змест курса прафесійнай педагогікі. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне курса і арганізацыя самастойнай работы студэнтаў.

### Раздзел І. Метадалагічныя асновы прафесійнай педагогікі

#### *Тэма 1. Прафесійная адукацыя як цэласны працэс*

Метадалагічныя асновы прафесійнай педагогікі: паняцце «прафесійная адукацыя» ў педагагічных даследаваннях; прафесійная адукацыя і адукацыйныя працэсы; суб'ект прафесійнай адукацыі; прафесійная педагогіка і прафесійна-педагагічны працэс.

Педагагічны працэс як адзінства прафесійнага выхавання, навучання, развіцця асобы. Прафесійна-педагагічны працэс як адзінства мэты, задач, зместу, сродкаў, форм і метадаў. Прафесійна-педагагічны працэс як адзінства дзейнасці выкладчыка і навучэнцаў. Катэгорыя «цэлае» і цэласны падыход у вывучэнні прафесійна-адукацыйных працэсаў. Заканамернасці і прынцыпы прафесійна-педагагічнага працэсу. Агульныя заканамернасці педагагічнага працэсу. Заканамернасці і прынцыпы працэсу харэаграфічнага выхавання. Заканамернасці і прынцыпы працэсу харэаграфічнага навучання. Заканамернасці і прынцыпы працэсу харэаграфічнага развіцця.

#### *Тэма 2. Мастацкая адукацыя як сістэма ўстаноў агульнай і прафесійнай мастацкай адукацыі*

Структура сістэмы мастацкай адукацыі. Асноўныя прынцыпы дзяржаўнай палітыкі ў сферы мастацкай адукацыі. Установы падсістэмы агульнай мастацкай адукацыі. Установы падсістэмы прафесійнай мастацкай адукацыі.

#### *Тэма 3. Мастацкая адукацыя як вынік мастацка-педагагічнага працэсу*

Паняцце «харэаграфічная культура асобы». Структура харэаграфічнай культуры асобы. Змест харэаграфічнай культуры

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

асобы. Мэта і задачы харэаграфічнай адукацыі як ідэальнае ўяўленне аб выніках мастацка-адукацыйнага працэсу. Харэаграфічная адукаванасць як вынік мастацка-адукацыйнага працэсу.

## Раздзел ІІ. Тэарэтычныя асновы мастацка-адукацыйнага працэсу

### *Тэма 4. Тэарэтычныя асновы харэаграфічнага выхавання*

Харэаграфічнае выхаванне чалавека як носьбіта сацыяльных адносін. Сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці харэаграфічнага выхавання асобы. Шляхі далучэння асобы да ўспрымання харэаграфічнага мастацтва.

### *Тэма 5. Тэарэтычныя асновы харэаграфічнага навучання*

Прадмет харэаграфічнай дыдактыкі. Змест харэаграфічнага навучання. Прадстаўленне зместу харэаграфічнага навучання ў нарматыўных дакументах навучальных устаноў.

### *Тэма 6. Тэарэтычныя асновы харэаграфічнага развіцця*

Узаемадзеянне сацыяльных і біялагічных фактараў у харэаграфічным развіцці асобы. Праблема музычных і харэаграфічных здольнасцей у навуковых даследаваннях. Паняцце і структура музыкальнасці. Фарміраванне харэаграфічных і музыкальных здольнасцей. Развіццё харэаграфічных і музыкальных здольнасцей у розных відах дзейнасці. Дыягностыка харэаграфічных і музыкальных здольнасцей.

### *Тэма 7. Метады, сродкі, формы мастацка-педагагічнай дзейнасці*

Метады мастацка-педагагічнай дзейнасці. Сродкі мастацка-педагагічнай дзейнасці. Арганізацыйныя формы мастацка-педагагічнай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Антагенез харэаграфічнай і музычнай адукацыі

### *Тэма 8. Прадмет гісторыі мастацкай адукацыі. Перыядызацыя гісторыі мастацкай адукацыі. Ідэі музычна-эстэтычнага выхавання асобы ў старажытныя часы, у сярэдневяковай Еўропе, на беларускіх і рускіх землях да XIV ст.*

Прадмет гісторыі мастацкай адукацыі. Перыядызацыя гісторыі мастацкай адукацыі. Агульная характарыстыка асноўных перыядаў мастацкай адукацыі ў айчыннай гісторыі. Ідэі музычна-эстэтычнага выхавання асобы ў старажытныя часы, у сярэдневяковай Еўропе, на беларускіх і рускіх землях да XIV ст.

### *Тэма 9. Станаўленне і развіццё харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў эпоху Адраджэння (XIV–XVI стст.) і Асветы (XVII–XVIII стст.) у Заходняй Еўропе, Расіі, на беларускіх землях*

Станаўленне і развіццё харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў эпоху Адраджэння (XIV–XVI стст.) і Асветы (XVII–XVIII стст.) у Заходняй Еўропе. Станаўленне і развіццё харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў эпоху Адраджэння (XIV–XVI стст.) і Асветы (XVII–XVIII стст.) у Расіі. Станаўленне і развіццё харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў эпоху Адраджэння (XIV–XVI стст.) і Асветы (XVII–XVIII стст.) на беларускіх землях.

### *Тэма 10. Харэаграфічная і музычная адукацыя ў Заходняй Еўропе, Расіі, на беларускіх землях у XIX – пачатку XX ст. Станаўленне і развіццё харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў XX ст. Замежныя сістэмы харэаграфічнай і музычнай адукацыі XX ст.*

Станаўленне і развіццё харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў XIX – пачатку XX ст. і ў XX ст. у Заходняй Еўропе, Расіі, на беларускіх землях. Замежныя сістэмы масавага харэаграфічнага і музычнага выхавання. Замежная педагогіка харэаграфічнай і музычнай адукацыі. Арганізацыя харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў замежных краінах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 11. Установы і арганізацыі падсістэм агульнай і прафесійнай харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь*

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі. Структура нацыянальнай сістэмы мастацкай адукацыі. Установы і арганізацыі падсістэмы агульнай харэаграфічнай і музычнай адукацыі. Установы падсістэмы прафесійнай харэаграфічнай і музычнай адукацыі.

## Раздзел IV. Мастацка-педагагічнае майстэрства

### *Тэма 12. Паняцце, структура, этапы і шляхі фарміравання мастацка-педагагічнага майстэрства*

Спецыфіка дзейнасці педагога-музыканта, яго месца і роля ў педагагічным працэсе. Паняцце мастацка-педагагічнага майстэрства. Структура мастацка-педагагічнага майстэрства. Этапы і шляхі фарміравання прафесійна-педагагічнага майстэрства.

### *Тэма 13. Змест мастацка-педагагічнага майстэрства*

Мастацка-педагагічная навучанасць. Мастацка-педагагічная выхаванасць. Мастацка-педагагічная развітасць.

### *Тэма 14. Педагагічная тэхніка як сродак рэалізацыі мастацка-педагагічнага майстэрства*

Майстэрства педагагічнай самарэгуляцыі. Майстэрства педагагічнага ўзаемадзеяння: стылі педагагічных зносін. Прынцыпы педагогікі супрацоўніцтва і іх рэалізацыя на ўроках харэаграфіі.

### *Тэма 15. Менеджмент дзіцячай школы мастацтваў: майстэрства і тэхналогія кіраўнічай дзейнасці*

Кіраванне пазнавальнай дзейнасцю вучняў на ўроках харэаграфіі. Забеспячэнне зваротнай сувязі і кіраванне самастойнай работай вучняў на ўроку. Кіраванне самастойнай пазакласнай работай вучняў. Прыёмы педагагічнага кантролю і ацэнкі ведаў, уменняў і навыкаў на ўроках харэаграфіі. Культура педагагічнай працы выкладчыка харэаграфіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Майстэрства і тэхналогія дзейнасці кіраўніка ДШМ. Агульныя асновы арганізацыі дзейнасці ДШМ. Асаблівасці арганізацыі навучання ў ДШМ. Планаванне работы выкладчыка ДШМ. Арганізацыя работы педагагічнага і метадычнага саветаў у ДШМ. Арганізацыя кантролю за работай ДШМ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

*1. Абдуллин, Э. Б.* Методологическая культура педагога-музыканта / Э. Б. Абдуллин. – М. : Владос, 2002. – 180 с.

*2. Кузьмініч, М. Л.* Гісторыя харэаграфічнай і музычнай адукацыі / М. Л. Кузьмініч. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2007. – 163 с.

*3. Кузьмініч, М. Л.* Тэарэтычныя асновы методыкі музычнай адукацыі / М. Л. Кузьмініч. – Мінск : НББ, 2013. – 364 с.

*4. Пракапцова, В. П.* Мастацкая адукацыя ў Беларусі / В. П. Пракапцова. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1999. – 210 с.

*Дадатковая*

*1. Кузьмініч, М. Л.* Гісторыя музычнага выхавання і адукацыі (ад старажытнасці да XIX ст.) / М. Л. Кузьмініч. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 2000. – 188 с.

*2. Кузьмініч, М. Л.* Мастацкая творчасць: універсітэцкая падрыхтоўка кадраў : манагр. / М. Л. Кузьмініч. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 142 с.

*3.* Основы подготовки специалистов-хореографов. Хореографическая педагогика : учеб. пособие / Е. Н. Громова [и др.] ; науч. ред. В. А. Звездочкин. – СПб. : СПбГУП, 2006. – 632 с. – (Библиотека Гуманитарного университета ; вып. 28).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пералік сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

У пералік сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці пры вывучэнні раздзела «Прафесійная педагогіка» вучэбнай дысцыпліны «Прафесійная педагогіка і методыка выкладання спецдысцыплін» уваходзяць:

– самастойныя работы;

– індывідуальныя заданні і тэматычныя даклады;

– ацэнка актыўнасці студэнтаў у час аналізу падрыхтаваных імі схем, рэфератаў і анатацый, групавых абмеркаванняў, тэматычных дыскусій;

– праверка канспектаў лекцый;

– апытанне;

– рэйтынгавая ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці;

– тэматычнае і выніковае тэсціраванне тэарэтычных ведаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Тэмы семінарскіх заняткаў і заданні для самастойнай работы

## Семінар 1. Арганізацыя харэаграфічнага выхавання асобы

1. Заканамернасці і прынцыпы харэаграфічнага выхавання чалавека.
2. Мэта і вынік працэсу харэаграфічнага выхавання чалавека.
3. Паняцце, структура і змест харэаграфічнай выхаванасці асобы.
4. Сацыяльна-псіхалагічныя асаблівасці харэаграфічнага выхавання ў сучасным грамадстве.
5. Харэаграфічнае мастацтва як сродак выхавання асобы. Шляхі далучэння асобы да харэаграфічнага мастацтва.
6. Асаблівасці арганізацыі харэаграфічнага выхавання ў сям'і, ва ўстановах дашкольнай і школьнай адукацыі, ва ўстановах дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.
7. Дзейнасць сродкаў масавай інфармацыі, творчых саюзаў, канцэртна-гастрольных, канцэртна-відовішчных і іншых устаноў і арганізацый па харэаграфічным выхаванні насельніцтва.

*Заданне для самастойнай работы:* падрыхтаваць анатацыю на кнігу аднаго з вядомых харэографаў і вызначыць яе педагагічную каштоўнасць.

*Літаратура да семінара: асноўная – 3 (с. 130–148, 166–211); дадатковая – 2;3; інтэрнэт-рэсурсы.*

## Семінар 2. Арганізацыя харэаграфічнага навучання асобы

1. Заканамернасці і прынцыпы харэаграфічнага навучання.
2. Харэаграфічная навучанасць як мэта і вынік працэсу харэаграфічнага навучання.
3. Задачы харэаграфічнага навучання.
4. Змест харэаграфічнага навучання.
5. Сродкі і метады харэаграфічнага навучання.
6. Формы арганізацыі харэаграфічнага навучання.
7. Арганізацыя кантролю за эфектыўнасцю харэаграфічнага навучання.

*Заданне для самастойнай работы:* наведаць урок харэаграфіі ў адной з навучальных устаноў і падрыхтаваць яго пісьмовы аналіз.

*Літаратура да семінара: асноўная – 3 (с. 110–129, 166–211); дадатковая – 1;2;3.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Семінар 3. Арганізацыя харэаграфічнага развіцця асобы

1. Заканамернасці і прынцыпы харэаграфічнага развіцця асобы.

2. Харэаграфічная развітасць як мэта і вынік працэсу харэаграфічнага развіцця асобы.

3. Структура музыкальнасці.

4. Фарміраванне і развіццё харэаграфічных і музыкальных здольнасцей.

5. Дыягностыка харэаграфічных і музыкальных здольнасцей.

*Заданне для самастойнай работы:* азнаёміцца са спецыяльнай літаратурай і падрыхтаваць сістэму дыягнастычных заданняў для выяўлення харэаграфічных і музыкальных здольнасцей.

*Літаратура да семінара: асноўная – 3 (с. 149–165, 166–211); дадатковая – 2; 3.*

## Семінар 4. Гісторыя харэаграфічнай адукацыі

1. Перыядызацыя гісторыі мастацкай адукацыі.

2. Ідэі музычна-эстэтычнага выхавання асобы ў старажытныя часы і ў сярэдневяковай Еўропе да XIV ст.

3. Станаўленне і развіццё харэаграфічный і музычнай адукацыі ў эпоху Адраджэння (XIV–XVI стст.).

4. Станаўленне сістэмы харэаграфічный і музычнай адукацыі ў Заходняй Еўропе, на беларускіх землях і ў Расіі ў XVII–XVIII стст.

5. Харэаграфічная і музычная адукацыя ў Заходняй Еўропе, на беларускіх землях і ў Расіі ў XIX – пачатку XX ст.

6. Станаўленне і развіццё савецкай сістэмы харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў Расіі і Беларусі.

7. Сучасная нацыянальная сістэма харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў Беларусі.

8. Замежныя сістэмы харэаграфічнага і музычнага выхавання дзяцей у XX ст.

*Заданне для самастойнай работы:* падрыхтаваць рэферат (прэзентацыю) аб арганізацыі харэаграфічнай і музычнай адукацыі ў адной з краін (у адной з навучальных устаноў) у розныя гістарычныя перыяды.

*Літаратура да семінара: асноўная – 2; 3; 4;*
*дадатковая – 1; 2; 3.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Семінар 5. Педагагічнае майстэрства выкладчыка харэаграфіі

1. Спецыфіка дзейнасці выкладчыка харэаграфіі.

2. Паняцце і структура мастацка-педагагічнага майстэрства.

3. Змест мастацка-педагагічнага майстэрства: мастацка-педагагічная выхаванасць, навучанасць і развітасць выкладчыка харэаграфіі.

4. Стылі педагагічных зносін у дзейнасці выкладчыка харэаграфіі.

5. Педагагічная тэхніка выкладчыка харэаграфіі.

6. Шляхі фарміравання педагагічнага майстэрства выкладчыка харэаграфіі.

*Заданне для самастойнай работы:* ацаніце ўзровень сфарміраванасці педагагічных здольнасцей і якасцей у сябе і аднаго з вядомых вам выкладчыкаў харэаграфіі (схема аналізу прыкладаецца); падрыхтуйце анатацыю на кнігу аднаго з вядомых педагогаў-харэографаў.

*Літаратура да семінара: асноўная – 3 (с. 298–349); дадатковая – 2; 3.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Студэнт*** ____________________

**СХЕМА АНАЛІЗУ**
**ўзроўню сфарміраванасці педагагічных якасцей і ўменняў**
**(педагагічная тэхніка)**

| Педагагічныя якасці і ўменні асобы | Узровень сфарміраванасці (у балах) | |
|---|---|---|
| | студэнт | педагог-майстар |

I. КУЛЬТУРА ЗНЕШНЯГА ВЫГЛЯДУ

1. Пастава:
– прамая
– уменне сядзець прама і свабодна
– падцягнутасць, сабранасць

2. Адзенне:
– акуратнасць
– сціпласць
– колеравая гармонія
– адпаведнасць адзення ўзросту, умовам заняткаў і работы
– адпаведнасць модзе
– пачуццё меры ў выбары ўпрыгожванняў

3. Грым (умеранасць)

4. Прычоска (акуратнасць)

5. Міміка:
– выражэнне добразычлівасці, спакою, упэўненасці (але не самаўпэўненасці)
– погляд пры зносінах скіраваны на субяседніка
– эмацыянальная выразнасць
– адпаведнасць выразу твару характару мовы

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Пантаміміка:

– жэсты да месца, арганічныя, натуральныя

– паходка пругкая, рытмічная, лёгкая

– рухі гнуткія, мерныя, натуральныя; адсутнічае скаванасць у рухах

– стрыманасць у рухах, адсутнасць мітуслівасці і нервовасці

– уменне бясшумна ўставаць і садзіцца

## II. КУЛЬТУРА ПЕДАГАГІЧНЫХ ЗНОСІН

1. Захаванне спакойнага добразычлівага тону ў зносінах:

– уменне слухаць суразмоўцу

– уменне задаваць пытанні

– уменне аналізаваць выступленне

– уменне першаму ўстанавіць кантакт з іншым чалавекам

– уменне зразумець іншага чалавека

– уменне зарыентавацца ў сітуацыі зносін

2. Імкненне да ўстанаўлення зрокавага кантакту:

– вы гледзіце на суразмоўцу (аўдыторыю)

– уменне бачыць і разумець рэакцыю слухачоў

1. Уменне зацікавіць, захапіць выступленнем, расказам, паведамленнем:

– свабоднае, вольнае вымаўленне без апоры на канспект

– знешні выгляд выражае гатоўнасць і жаданне да зносін, весці гутарку, выступаць

– уменне перадаваць сваё стаўленне да таго, пра што ідзе гаворка

## III. САМАРЭГУЛЯЦЫЯ

1.Уменне знімаць залішняе напружанне, хваляванне

2.Уменне пераадольваць у сабе нерашучасць перад выступленнем

3.Уменне мабілізаваць рабочае самаадчуванне

4.Уменне стрымліваць сябе ў стрэсавых сітуацыях

5.Уменне ствараць неабходны настрой

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## IV. КУЛЬТУРА МОВЫ

1. Граматычная правільнасць мовы, захаванне правільнага націску
2. Лексічнае багацце
3. Выразнасць, вобразнасць мовы
4. Тэхніка мовы:

– палётнасць, звонкасць голасу
– гнуткасць голасу, багацце інтанацыі
– правільна выбраная сіла голасу
– выразная дыкцыя (адсутнасць гугнявасці, шапялявасці і іншых дэфектаў)
– захаванне неабходнага тэмпу мовы

***Заўвагі:***

– кожная пазіцыя ацэньваецца па 5-бальнай сістэме, потым разлічваецца сярэдні бал па кожнаму з чатырох асноўных блокаў;
– прозвішча педагога можна не ўказваць.

Схема ўзята з дапаможніка: Основы педагогического мастерства: учеб. пособие / под ред. И. А. Зязюна. – М. : Просвещение, 1989. – 302 с. (с. 31).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ПРАФЕСІЙНАЯ ПЕДАГОГІКА**
**І МЕТОДЫКА ВЫКЛАДАННЯ СПЕЦДЫСЦЫПЛІН**
**Раздзел 1. ПРАФЕСІЙНАЯ ПЕДАГОГІКА**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 02 01 Харэаграфічнае мастацтва (па напрамках)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2015. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,22. Ул.-выд. арк. 0,59. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.